# МІФ ЯК АСНОВА МАСТАЦКАГА СВЕТАПОГЛЯДУ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ (ПАВОДЛЕ АПОВЕСЦІ “ДЗЕЦІ ГАМУНКУЛУСА”)

***Герцык І.А.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр)*
***Навуковы кіраўнік –*** *Т.С. Нуждзіна, канд. філал. навук, дацэнт*

Канец XX стагоддзя выявіў павышаную цікавасць сучасных літаратуразнаўцаў і пісьменнікаў да праблемы міфалагічнага ў нацыянальнай мадэлі свету. Гэта выразна праявілася ў работах такіх навукоўцаў, як У. Конан, А. Ненадавец, Т. Шамякіна, у мастацкай канцэпцыі нацыянальнай гісторыі У. Караткевіча, У. Арлова, Л. Рублеўскай і інш. Цікавыя разважанні адносна міфа і мастацкай міфалагізацыі рэальнасці прафесара Шамякінай. Паводле яе выказвання, адным з тыпаў мастацкай міфалагізацыі з’яўляецца ўвядзенне асобных міфалагічных матываў і персанажаў, узбагачэнне канкрэтна-гістарычных вобразаў універсальным сэнсам.

Арыентацыя Л. Рублеўскай на фальклорна-міфалагічны пачатак праявілася амаль з першых крокаў у асваенні такой эпічнай формы, як аповесць. Яе аповесць “Дзеці гамункулуса” заснавана на выкарыстанні нацыянальнай традыцыі спасціжэння мастацкай літаратурай асаблівасцей успрымання беларусам мінулых эпох загадкавых, таямнічых і часам небяспечных з’яў навакольнага свету, што ўплывалі на яго светапоглядныя асновы, псіхалагічны, духоўна-эмацыянальны стан (Я. Баршчэўскі, М. Гарэцкі, У. Караткевіч).

Міфы ствараліся не толькі ў далёкай старажытнасці. Узнікла іх нямала і ў савецкую пару. Так, пісьменніца Людміла Рублеўская, якая не хавае сваёй прыхільнасці да мастацкіх канцэпцый У. Караткевіча, у аповесці “Дзеці гамункулуса”, як і аўтар “Дзікага палявання караля Стаха”, развіццё сюжэта звязвае з прыездам галоўнага персанажа ў новыя мясціны і яго адносінамі да многіх незразумелых з пункту гледжання здаровай логікі з’яў. Фантастычны пачатак аповесці “Дзеці гамункулуса” адразу



МГПУ им. И.П.Шамякина

тлумачыць, што гамункулус – гэта чалавекападобная істота, створаная штучна ў колбе вучоным алхімікам Твардоўскім, які, не ведаючы, што рабіць з вынайдзенай пачварай, кідае яе ў калодзеж. Флюідамі бездухоўнасці і агрэсіўнасці атручана самае важнае ў жыцці чалавека – вада. Гамункулус не знік бясследна. Ён, такім чынам, становіцца міфічным знішчальнікам чалавечай душы, яго волі, энергіі. Пісьменніца, такім чынам, даследуе вытокі грамадскай пасіўнасці суайчыннікаў, апелюючы да прыроды міфічнага. У выніку – таленавіта раскрываецца механізм апрацоўкі свядомасці чалавека, уздзеяння бальшавіцкіх ідэалагем на праявы індывідуальна-духоўнага.



МГПУ им. И.П.Шамякина